# ПРАВЕРКА НА БЯСПЕКУ

## «Забруджаных» проб стала значна менш, аднак пільнасці губляць не варта

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Лічыцца, што больш за ўсіх ад наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС пацярпелі Гомельшчына, Магілёўшчына і часткова Брэстчына. Аднак і ў адносна «чыстых» рэгіёнах ёсць тэрыторыі, якія забруджаны радыенуклідамі. У Мінскай вобласці «плямы» маюць шэраг раёнаў, бадай, адна з самых вялікіх па тэрыторыі — на Валожыншчыне.**

Нягледзячы на тое, што пасля чарнобыльскай катастрофы прайшло ўжо больш чым дваццаць гадоў, праблема рэабілітацыі пацярпелых тэрыторый застаецца надзвычай актуальнай. У Валожынскім раёне «пад радыяцыяй» апынуліся больш за 13 тысяч гектараў сельскагаспадарчых палеткаў. Ступень забруджвання розная: «доза» ад 1 да 5 кюры на квадратны кіламетр адзначаецца на 11,8 тыс. га, ад 5 да 10 — на 1,2 тыс. га, ад 10 да 15 — на 35 га.

— Забруджаныя ў рознай ступені ўчасткі ёсць на тэрыторыі 12 гаспадарак раёна (усяго іх 21), — адзначае начальнік Валожынскага філіяла прадпрыемства «Мінаблхімізацыя» Ганна Яфімчык. — Гэтыя палеткі не выводзіліся з севазвароту, на іх у асноўным вырошчваюць кармавыя культуры. Бульбу, агародніну тут не сеюць, зрэдку — збожжавыя. Зразумела, што на забруджаных участках прымяняецца спецыяльная тэхналогія вырошчвання сельскагаспадарчых культур. На гэтых плошчах уносяцца павышаныя дозы мінеральных угнаенняў. Справа ў тым, што расліны ў тым выпадку, калі адчуваецца недахоп угнаенняў, актыўна назапашваюць радыенукліды. Гэтага трэба пазбегнуць.

— А не адбываецца ў такім разе «перадазіроўка» мінеральнымі ўгнаеннямі прадукцыі і ці не ўзнікае праблема, напрыклад, па нітратах?

— Праблем па нітратах не ўзнікае, паколькі ўносяцца павышаныя дозы толькі фосфарных і калійных угнаенняў. Якасць прадукцыі з цягам часу пастаянна павышаецца, гэта пытанне даволі жорстка кантралюецца.

Сёлета ў Валожынскім раёне на забруджаныя сельскагаспадарчыя палеткі было ўнесена 1,2 тысячы тон калійных і 476,2 тоны фосфарных угнаенняў. Выдаткі адпаведна склалі 252,7 і 646,8 мільёна рублёў. Акрамя гэтага праводзіцца і вапнаванне палеткаў. Як адзначаюць спецыялісты, пры нейтралізацыі павышанай кіслотнасці глебы і давядзення яе да аптымальнага ўзроўню ў 1,5—2 разы змяншаецца паступленне стронцыю-90 і цэзію-137 у расліны. Сёлета на вапнаванне на Валожыншчыне было выдаткавана 256,8 мільёна рублёў. Пастаўкі ўгнаенняў, як паведаміла Ганна Яфімчык, адбываюцца своечасова, таму на «праблемных» участках у поўнай ступені ўдаецца вытрымліваць неабходную тэхналогію вырошчвання сельскагаспадарчых культур.

Перыядычна (раз у чатыры гады) робіцца аграхімічнае і радыебіялагічнае абследаванне забруджаных палеткаў. Пасля складаецца спецыяльная «карта», на падставе якой і праводзяцца ахоўныя мерапрыемствы.

— За кошт унясення павышаных доз мінеральных угнаенняў утрыманне радыенуклідаў у глебе з цягам часу нават змяншаецца, — заўважае заатэхнік-радыёлаг Валожынскай міжгаспадарчай аграхімічнай лабараторыі Аксана Кураш. — У грамадскім сектары апошнім часам не было нестандартных проб прадукцыі, з перавышэннем дапушчальнага ўзроўню.

Спецыялісты Валожынскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі правяраюць усе прадукты харчавання. Сюды можа звярнуцца любы жыхар і патрэбны аналіз прадукцыі яму зробяць абсалютна бясплатна. Адразу пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, як узгадваюць супрацоўнікі цэнтра, быў сапраўдны ажыятаж з праверкамі — звярталася вельмі шмат людзей, нават вялікія чэргі ўтвараліся. Зараз такой актыўнасці няма, аднак жыхары рэгулярна прыносяць прадукцыю на кантроль. Здараецца, што адзначаецца павышаны радыяцыйны фон. У асноўным гэта датычыцца «дароў лесу». Напрыклад, сёлета былі дзве пробы з перавышэннем дапушчальнага ўзроўню ўтрымання радыяцыі. Абодва выпадкі — па грыбах. Аднак раней нестандартных проб было намнога больш — напрыклад, у 2000 годзе 14.

— Асноўнай прычынай такой сітуацыі з'яўляецца тое, што, на мой погляд, людзі сталі больш адукаванымі ў гэтых пытаннях, — лічыць фельчар-лабарант па радыяцыйнай гігіене Валожынскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ганна Калітнік. — Лепш яшчэ раз да нас на праверку прадукцыю прынесці, чым рызыкаваць сваім здароўем. У залежнасці ад актыўнасці (калі яна, напрыклад, невысокая) з грыбоў можна «вывесці» радыяцыю. Трэба пакласці іх у ваду, дабавіць солі і варыць 10—15 хвілін. Пасля ваду зліць і зрабіць такую аперацыю 3—4 разы. Такім чынам грыбы стануць практычна чыстыя. Але не ўсе — тыя, што актыўна назапашваюць радыяцыю (махавікі, маслякі, «курачкі» і інш.), ужо не вывармыш.

Пункты праверкі прадукцыі на Валожыншчыне ёсць паўсюль, так што пракантраляваць бяспеку чалавек можа без праблем. Было б жаданне. Далёка не ўсе жыхары разумеюць важнасць праблемы. Асобныя кажуць: «Сабраў грыбы і буду іх есці, нічога са мной не здарыцца». Яны рызыкуюць сваім здароўем, бо радыенукліды назапашваюцца ў арганізме.

Як заўважае Ганна Калітнік, чалавек павінен правільна харчавацца і выконваць неабходныя меры перасцярогі. Па-першае, усю садавіну і агародніну трэба добра прамываць і ачышчаць, каб не было вонкавага забруджвання. Пажадана правяраць усе «дары лесу». Калі ж вы набываеце іх на рынку, то абавязкова неабходна патрабаваць у гандляра даведку аб радыеметрычным кантролі. Інакш могуць узнікнуць праблемы. Паводле слоў Ганны Калітнік, неаднойчы людзі прыносілі на праверку ягады, якія набылі на рынку і забыліся спытаць пра даведку. Здаралася, што «дары лесу» аказваліся забруджанымі.

— Трэба быць надзвычай асцярожнымі, — лічыць Ганна Калітнік. — Кантроль за чысцінёй прадукцыі, канешне, наладжаны даволі жорсткі, аднак кожны з нас ніколі не павінен губляць пільнасці.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*Валожынскі раён.*

**Погляд**

# Кропка ў энергетычнай спрэчцы не пастаўлена?..

**Сітуацыя вакол энергетычнай спрэчкі, якая сёння назіраецца паміж Беларуссю і Расіяй, можа знайсці сваё вырашэнне ў бліжэйшы час — зацікаўленыя бакі павінны абмеркаваць усе акалічнасці гэтага пытання за сталом перагавораў, — такую думку ў гутарцы з нашым карэспандэнтам выказаў эксперт «Звязды», дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ.**

— Па-першае, кантракт у 100 долараў за 1 тысячу кубічных метраў газу, сапраўды, істотна пагаршае ўмовы гаспадарання для беларускіх суб'ектаў, ставіць іх ў няроўнае становішча з расійскімі, — каментуе рашэнне аб павышэнні расійскім бокам кошту блакітнага паліва для нашай краіны Міхаіл Кавалёў. — Аднак ва ўмовах, што склаліся, гэта максімум з таго, што змаглі атрымаць нашы перагаворшчыкі. Па-другое, мы выключна правільна зрабілі, што раздзялілі два пытанні — продаж акцый «Белтрансгаза» і цану на газ. Тое, што прапаноўвалі расіяне — было невыгадна палітычна і псіхалагічна для Беларусі: гэта выглядала б так, што мы атрымліваем газ танна, аднак пры гэтым забываліся б пра тое, што частку паліва мы аплацілі «Белтрансгазам». А так, як казаў Прэзідэнт Расіі: «Катлеты — асобна, мухі — асобна». Гэта значыць: газ — асобна, «Белтрансгаз» — асобна. На мой погляд, тут усё зроблена прафесіянальна.

***— Тым не менш аднаго «сюрпрызу», што атрымалі мы напярэдадні Новага года ад расійскіх партнёраў, як высветлілася, было мала. Урадам суседняй дзяржавы таксама прынята рашэнне, якое па сутнасці парушае пагадненні па забеспячэнню свабоднага гандлю паміж дзвюма краінамі, — РФ увяла пошліны на экспартуемую ў Беларусь нафту.***

— Трэба прызнаць, што гэта пытанне больш балючае, чым газ. Размова ідзе аб істотна больших сумах. Калі Расія аб'явіла, што фактычна выходзіць з мытнага саюза і будзе браць экспартную пошліну па мяжы з Беларуссю, яна сапраўды паставіла нас у надзвычай складанае становішча. 15 працэнтаў ад экспартнай пошліны, якія прапаноўвалі нам расійскія нафтавікі з панскага пляча, зразумела, было непрымальным варыянтам для нашай краіны, улічваючы значную залежнасць расійскіх паставак у Еўропу ад той палітыкі, якую мы тут праводзім. Я заўсёды казаў, што энергетычная бяспека Беларусі заснавана на велічыні патоку, што праходзіць праз нашу рэспубліку. Усё ж такі мы «сядзім» на трубах, па якіх праходзіць паліва, і калі труба мае вельмі вялікі дыяметр — тым больш наша энергетычная бяспека. Таму наш адказ быў адэкватны, мы перасавалі мяч на расійскі бок. Наўрад ці расіяне пагодзяцца плаціць пошліну ў 45 долараў ЗША — для іх гэта нявыгадна. Усім зразумела, што ідзе гандаль ў дзяльбе экспартных пошлін на нафту, і фактычна размова ідзе аб тым, застанёмся мы ў адзінай мытнай прасторы ці не. Мяркую, як толькі святы скончацца, расіяне пойдуць на перагаворы.

***— З 1 студзеня Беларусь, як мы ўжо ўзгадвалі, увяла мытную пошліну на транспарціроўку нафты па нафтаправоду, што праходзіць праз тэрыторыю нашай краіны. Зараз шмат размоў вакол таго, наколькі прымальная велічыня гэтай пошліны?***

— Пытанне аб 45 доларах, магчыма, дыскусійнае. І, магчыма, што гэтай мытнай пошліны не будзе, а будуць у разумнай прапорцыі падзелены экспартныя пошліны. Прычым не важна, як мы яе назвалі. Мы маглі гэта назваць экалагічным зборам: усё ж такі праз нашу тэрыторыю праходзіць экалагічна небяспечны тавар у вялікай колькасці, які да таго ж каштуе астранамічна дорага. Нават 3,5 мільярда долараў за транзіт, па вялікаму рахунку, улічваючы колькі каштуюць 70 мільёнаў тон нафты, для расіян невялікая сума. Аднак у адрозненне ад газу, дзе ў перагаворах удзельнічала дзяржаўная кампанія «Газпрам», тут ужо закрануты інтарэсы не толькі расійскай кампаніі «Транснафта», але, безумоўна, інтарэсы і расійскіх транснацыянальных нафтавых карпарацый накшталт «Лукойла» і інш. Таму тут будзе больш балючае пытанне. Хоць значная частка нафты перапрацоўвалася на беларускай тэрыторыі, выйгравалі не толькі беларусы, але і расійскія пастаўшчыкі нафты: тут быў больш выгадны канал паставак, чым праз іншыя сумежныя дзяржавы. Таму расійскія нафтавыя алігархі з вялікім задавальненнем запампоўвалі ў Беларусь нафту, тут яе перапрацоўвалі і атрымлівалі дадатковы прыбытак з-за крыху меншых экспартных пошлін у нашай краіне, чым у РФ.

Я б хацеў звярнуць увагу на тое, што мы ўсё ж такі дзве брацкія дзяржавы і доўга гуляць у паддаўкі і тым, і другім не трэба. Паўтаруся: мяркую, як толькі ў Расіі скончацца святы, яны сядуць за стол перагавораў. А вось канчатковая прапорцыя дзяльбы экспартных пошлін, зразумела, будзе залежаць ад майстэрства перагаворшчыкаў — і з таго, і з другога боку. Для нас, на мой погляд, дзейсным інструментам напярэдадні перагавораў у шэрагу іншых мераў маглі б стаць і захады, у выніку якіх уся Еўропа таксама ўсвядоміла б, што Беларусь тут іграе значную ролю, і ідзе на гэты крок вымушана, таму што расіяне пад маркай святаў ніяк не адрэагавалі на тое, што спачатку неабходна вызначыцца па галоўных пытаннях, а толькі потым святкаваць.

Сваё бачанне праблемы, што датычыцца сітуацыі ў энергетычнай спрэчцы, выказаў «Звяздзе» **кіраўнік цэнтра «Стратэгія» Леанід ЗАІКА**. У прыватнасці, мы запыталіся ў эксперта: як, на яго погляд, далей будуць развівацца падзеі?

— Далей як у боксе — да першай траўмы: атрымліваю першую сур'ёзную траўму і суддзя спыняе матч, — лічыць Леанід Заіка. — Расіяне могуць абмежаваць імпарт тавараў з Беларусі. Тады мы што-небудзь увядзём, затым — яны, потым зноў мы... І, вобразна кажучы, з'ядзім па шклянцы гарчыцы. Нехта першы павінен спыніцца...

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## У КЛІЧАВЕ АДКРЫЛАСЯ НОВАЯ ШКОЛА

**У Клічаве ўчора адбылося ўрачыстае адкрыццё новай сярэдняй школы №1 на 720 месцаў.**

У мерапрыемстве ўзяў удзел старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура.

**БЕЛТА.**

## ГАЛОЎНЫ САНІТАРНЫ ЎРАЧ РАСІІ ВЫСОКА АЦАНІЎ ЯКАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ СЕЛЬГАСПРАДУКТАЎ

Галоўны санітарны ўрач Расіі Генадзь Анішчанка высока ацаніў якасць беларускіх сельгаспрадуктаў і выказаў упэўненасць у далейшых іх пастаўках на расійскія рынкі. У інтэрв'ю радыё «Рэха Масквы» ён падкрэсліў, што беларускія прадукты заўсёды адпавядалі «ўсім патрабаванням па якасці і бяспецы. Беларусь на рынкі Расіі заўсёды пастаўляла добрую сельскагаспадарчую прадукцыю». «І я б хацеў, каб так і было, і, напэўна, так і будзе», — сказаў галоўны санітарны ўрач Расійскай Федэрацыі.

**Кар. БЕЛТА.**

## КОЖНАМУ СКВЕРУ — СВАЮ НАЗВУ

Скверы і парк, якія да гэтага часу на карце горада абазначаліся толькі як «зялёныя масівы», набылі назвы. Так, сквер на скрыжаванні вуліц Кісялёва і Старавіленскай стаў Сцяпанаўскім садам, праспекта Машэрава і вуліцы Старажоўскай — Старажоўскім скверам, уздоўж Сляпянскай сістэмы — Антонаўскім паркам. Мінчане, якія пражываюць на вуліцах Варанянскага і Ляўкова, будуць прагульвацца ў скверы Сенажаны, Прытыцкага, Глебкі і Матусевіча — парку Цівbooлі, вуліцы Чарвякова і Старавіленскага тракту — Пераспенскім скверы. А сквер паміж вуліцамі Ленінградскай, Свярдлова і Кірава, вядомы мінчанам як Міхайлаўскі, цяпер па рашэнню дэпутатаў Мінгарсавета будзе афіцыйна так называцца.

**Наталля ЗАЯЦ,**
*«Мінск—Навіны».*

**Ва ўрадзе**

# У Беларусі вызначаны парадак выпуску аблігацый, забяспечаных абавязацельствамі па крэдытах на жыллё

**У Беларусі вызначаны парадак выпуску, абарачэння і пагашэння аблігацый, якія выпускаюцца банкамі. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў і Нацыянальнага банка Беларусі ад 29.12.2006 года № 1753/22.**

Новы дакумент рэгулюе асаблівасці выпуску, размяшчэння, абарачэння і пагашэння аблігацый, забяспечаных абавязацельствамі па вяртанню асноўнай сумы доўгу і выплаце працэнтаў па прадастаўленых крэдытах на будаўніцтва, рэканструкцыю або набыццё жылля пад заклад нерухомай маёмасці.

Аблігацыі будуць выпускацца банкам-эмітэнтам, які ажыццяўляе ва ўстаноўленым парадку прыцягненне ва ўклады сродкаў фізічных асоб, па ўзгадненню з Нацыянальным банкам. Пры гэтым сродкі, атрыманыя гэтымі банкамі ад выпуску аблігацый, будуць накіроўвацца на рэфінансаванне раней выдадзеных крэдытаў на будаўніцтва, рэканструкцыю або набыццё жылля пад заклад нерухомай маёмасці.

Аблігацыі будуць выпускацца ў бездакументарнай форме (у выглядзе запісу на рахунках). Забеспячэннем аблігацый з'яўляюцца абавязацельствы юрыдычных і фізічных асоб па вяртанню асноўнай сумы доўгу і выплаце працэнтаў па прадастаўленых банкамі-эмітэнтамі крэдытах на будаўніцтва, рэканструкцыю або набыццё жылля пад заклад нерухомай маёмасці.

Правядзенне здзелак куплі-продажу аблігацый пры іх абарачэнні юрыдычнымі і фізічнымі асобамі будзе ажыццяўляцца праз гандлёвую сістэму ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа». Пры гэтым набыццё фізічнымі асобамі аблігацый пры іх размяшчэнні і правядзенне здзелак куплі-продажу праз гандлёвую сістэму біржы будзе ажыццяўляцца праз банкі, якія маюць права ва ўстаноўленым парадку прыцягваць ва ўклады сродкі фізічных асоб на падставе дагавора, заключанага паміж фізічнай асобай і банкам. Пагашэнне аблігацый і выплата па іх працэнтнага даходу будзе праводзіцца банкам-эмітэнтам у тэрміны і парадку, названых у праспекце эмісіі (рашэнні аб выпуску) аблігацый у адпаведнасці з заканадаўствам аб каштоўных паперах.

У дакуменце таксама сказана, што банк-эмітэнт мае права застрахаваць сваю адказнасць перад уладальнікамі аблігацый за прычыненне шкоды ў сувязі з невыкананнем абавязацельстваў па аблігацыях.

**БЕЛТА.**

**Будні «Аховы»**

# Навагодні падарунак — выратаванае жыццё

**Не так даўно мы расказвалі аб тым, як супрацоўнікі Лепельскага аддзела Дэпартамента аховы выратавалі чалавека на пажары. І літаральна напярэдадні навагодняга свята каля 10 гадзін вечара двое супрацоўнікаў таго ж Лепельскага аддзела Дэпартамента аховы, а менавіта прапаршчык міліцыі Уладзіслаў Кармілічаў і старшына міліцыі Дзмітрый Клачкоў, не раздумваючы, кінуліся ў ледзяную ваду, каб выцягнуць адтуль 50-гадовага мужчыну...**

Праз некалькі хвілін на месца здарэння прыбыў першы намеснік начальніка Лепельскага РАУС маёр міліцыі Аляксандр Гарус, які таксама паспяшаўся на дапамогу. Ужо ўтраіх міліцыянеры выцягнулі чалавека на бераг. Брыгада «хуткай дапамогі» даставіла выратаванага ў рэанімацыйнае аддзяленне Лепельскай цэнтральнай бальніцы з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне». Прапаршчык міліцыі Уладзіслаў Кармілічаў таксама змешчаны ў бальніцу з тымі ж сімптомамі.

Дарэчы, абодва міліцыянеры аховы — старшына Клачкоў і прапаршчык Кармілічаў — маюць свае сем'і, у якіх выхоўваюцца дзеці адпаведна 2 і 5 гадоў. Старшына Клачкоў ужо мае 18 заахвочванняў па службе, а яго калега Уладзіслаў паспяхова вучыцца на 3-м курсе Акадэміі МУС. Кіраўніцтвам Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь прынята рашэнне аб заахвочванні супрацоўнікаў Лепельскага аддзела міліцыянера-кінолага ўзвода міліцыі старшыны Дзмітрыя Васільевіча Клачкова і прапаршчыка міліцыі Уладзіслава Вітальевіча Кармілічава за іх па-сапраўднаму геройскі ўчынак.

**Марына ЭВЕРСМАН.**

# Канфіскавана партыя наркотыкаў на 200 тысяч еўра

**Праваахоўнікі спынілі дзейнасць міжнароднай злачыннай групы, якая арганізавала пастаўку і распаўсюджанне псіхатропных рэчываў з Літвы ў Беларусь.**

Як адзначаюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, гэта стала магчымым дзякуючы скаардынаваным дзеянням галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Беларусі і Літоўскай крымінальнай паліцыі. Паводле інфармацыі беларускіх праваахоўнікаў, у Вільнюсе былі затрыманы двое жыхароў Друскінінкая. У гэты ж дзень у Гродзенскай вобласці ў ходзе спецаперацыі ўдалося затрымаць дваіх беларусаў, якія арганізавалі збыт псіхатропных рэчываў на тэрыторыі нашай краіны. У літоўскіх і беларускіх наркадзялкоў было канфіскавана каля 4,5 тысячы таблетак MDMA і невялікая колькасць іншага сінтэтычнага наркотыка. Паводле папярэдніх ацэнак, кошт гэтага дурману складае каля 200 тысяч еўра, і гэта адна з буйнейшых партый сінтэтычных наркотыкаў, што канфіскаваны за апошні час.

**Ігар ГРЫШЫН.**

**Да ўвагі чытачоў!**

# АБ ДЭКЛАРАВАННІ ДАХОДАЎ

Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь інфармуе аб тым, што ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з фізічных асоб» (далей — Закон) фізічныя асобы, якія атрымлівалі на працягу 2006 года абкладваемыя падаходным падаткам даходы з некалькіх крыніц і іх сукупны гадавы даход перавысіў 7 360 010 рублёў, абавязаны не пазней чым 1 сакавіка 2007 г. прадаставіць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковую дэкларацыю (разлік) аб сукупным гадавым даходзе за 2006 год (далей — дэкларацыя).

Незалежна ад якіх бы там ні было ўмоў дэкларацыю абавязаны прадаставіць фізічныя асобы, якія прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь (асобы, якія фактычна знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь больш за 183 дні ў каляндарным годзе) і што атрымлівалі на працягу 2006 года даходы ад фізічных асоб, якія не з'яўляюцца падатковымі агентамі, даходы з крыніц за межамі Рэспублікі Беларусь, і даходы, утрыманне падатку з якіх не ўскладзена на падатковых агентаў. Да такіх даходаў, у прыватнасці, належаць:

— кампенсацыя (пакрыццё) маральнай шкоды, у тым ліку па рашэнню суда (напрыклад, пакрыццё маральнай шкоды, нанесенай распаўсюджваннем звестак, якія зняслаўляюць гонар і годнасць грамадзян, дзелавую рэпутацыю, недатыкальнасць прыватнага жыцця, асабістай і сямейнай тайны), за выключэннем кампенсацыі (пакрыцця) маральнай шкоды пры страце працаздольнасці, звязанай з калецтвам або іншым пашкоджаннем здароўя, а таксама ў сувязі са стратай карміцеля;

— даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі на працягу каляндарнага года ад выплатнага адчужэння (у тым ліку шляхам продажу, мены, рэнты) фізічнай асобе больш за адну на працягу пяці гадоў кватэры, больш за адзін на працягу пяці гадоў жылога дома, больш за адну на працягу пяці гадоў дачу, больш за адзін на працягу пяці гадоў садовага доміка з гаспадарчымі пабудовамі, больш за адзін на працягу пяці гадоў гараж, больш за адзін на працягу пяці гадоў зямельны ўчастак, якія належаць ім на праве ўласнасці, ад выплатнага адчужэння на працягу каляндарнага года больш за адзін аўтамабіль або іншы транспартны сродак;

— даходы ад выплатнага адчужэння фізічнай асобе прадпрыемства як маёмаснага комплексу, вытворчых будынкаў (цэхаў, ангараў, магазінаў і іншых), паветраных і марскіх суднаў, суднаў унутранага плавання, суднаў плавання «рака—мора», твораў навукі, літаратуры і мастацтва, вынаходніцтваў, карысных мадэляў, прамысловых узораў, селекцыйных дасягненняў, нераскрытай інфармацыі, у тым ліку сакрэтаў вытворчасці (ноў-хау), фірменных назваў, таварных знакаў;

— даходы ад адчужэння долі (укладу, паю) у статутным фондзе арганізацыі або яе часткі, каштоўных папер, уключаючы даходы ад рэалізацыі імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» і «Маёмасць» іншай фізічнай асобе;

— даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі за мяжой або з-за мяжы. Да такіх даходаў можна аднесці заработную плату, прэміі і іншыя ўзнагароджанні, звязаныя з выкананнем працоўных абавязкаў; стыпендыі, падарункі ў грашовай і натуральнай форме ад далёкіх сваякоў, напрыклад, сяброў і г.д.;

— даходы, атрыманыя па працоўных дагаворах з фізічнымі асобамі (напрыклад, даходы, атрыманыя ад іншай фізічнай асобы за працу ў якасці няньці, садоўніка, вартаўніка, шафёра, трэнера, ахоўніка);

— даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі ад дыпламатычных, консульскіх і іншых афіцыйных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў, калі крыніцай выплаты не ўтрымліваўся падаходны падатак у адпаведнасці з Законам;

— даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, ад здачы ў арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых і нежылых памяшканняў іншым фізічным асобам, якія не з'яўляюцца прадпрымальнікамі, памер якога перавысіў 500 базавых велічынь у справаздачным годзе;

— даходы, атрыманыя ад здачы ў арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых і нежылых памяшканняў ад арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў пры ўмове, што такія даходы абкладаліся падаходным падаткам па прагрэсіўнай шкале ставак падаходнага падатку (па стаўках пункта 1 артыкула 18 Закона) і сума абкладваемага сукупнага гадавога падатку перавысіла 7 360 010 руб.;

— даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, ад здачы ў арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых і (або) нежылых памяшканняў, размешчаных за межамі Рэспублікі Беларусь.

Ад падачы дэкларацыі вызваляюцца фізічныя асобы, якія атрымалі ў 2006 годзе:

1. даходы, якія не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання, напрыклад: даходы, атрыманыя ад аперацый, звязаных з маёмаснымі і немаёмаснымі адносінамі фізічных асоб, якія знаходзяцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь паміж сабой у шлюбе, адносінах блізкага сваяцтва, усынавіцеля і ўсыноўленага, апекуна, папячыцеля і падапечнага, за выключэннем даходаў, атрыманых указанымі фізічнымі асобамі ў выніку заключэння паміж імі працоўных дагавораў куплі-продажу і (або) грамадзянска-прававых дагавораў, звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці;

— грашовыя сродкі, атрыманыя па дагавору пазыкі;

— грашовыя сродкі, якія атрымлівае фізічная асоба для пагашэння абавязацельстваў па дагавору пазыкі (вяртанне доўгу);

2. даходы, якія не падлягаюць падаткаабкладанню незалежна ад іх памеру, напрыклад:

— пенсіі, якія назначаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

— аліменты, якія атрымліваюць фізічныя асобы ў выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

— стыпендыі навучэнцаў, студэнтаў і слухачоў навучальных устаноў, у памерах, якія вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (або) Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама стыпендыі, што выплачваюцца ў перыяд прафесійнага навучання з Дзяржаўнага фонду садзейнічання занятасці;

— дапамога (акрамя дапамогі па часовай непрацаздольнасці і дапамогі па догляду хворага дзіцяці);

— даходы (акрамя даходаў, атрыманых плацельшчыкамі ад выплатнага адчужэння маёмасці ў сувязі з ажыццяўленнем імі прадпрымальніцкай дзейнасці), атрыманыя плацельшчыкамі ад выплатнага адчужэння на працягу 2006 года аднаго аўтамабіля ці іншага транспартнага сродку;

— даходы (акрамя даходаў, атрыманых плацельшчыкамі ад выплатнага адчужэння маёмасці ў сувязі з ажыццяўленнем імі прадпрымальніцкай дзейнасці), атрыманыя плацельшчыкамі ад выплатнага адчужэння на працягу 5 гадоў (у тым ліку шляхам продажу, мены, рэнты) аднаго жылога дома, адной кватэры, адной дачы, аднаго садовага доміка з гаспадарчымі пабудовамі, аднаго гаража, аднаго зямельнага ўчастка, якія належаць ім на праве ўласнасці;

— даходы ў грашовай і натуральнай форме, атрыманыя ад фізічных асоб у выглядзе спадчыны як у Рэспубліцы Беларусь, так і за яе межамі;

3. даходы, якія не падлягаюць абкладанню падаходным падаткам ва ўстаноўленых Законам межах з усіх крыніц на працягу каляндарнага года:

— даходы, атрыманыя ад фізічных асоб, якія прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь і не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у межах 500 базавых велічынь у суме з усіх крыніц на працягу каляндарнага года ў выніку дарэння і ў выглядзе нерухомай маёмасці па дагавору рэнты бясплатна;

— даходы, якія не з'яўляюцца ўзнагароджаннямі за выкананне працоўных або іншых абавязкаў і якія не атрымліваюцца ад арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, у тым ліку ў выглядзе матэрыяльнай дапамогі, падарункаў і прызоў, аплаты кошту пуцёвак, у межах 150 базавых велічынь у суме з усіх крыніц на працягу каляндарнага года. Гэтая льгота не абмежавана ні характарам выплат, ні месцам працы (асноўнае ці не асноўнае);

— даходы, якія не з'яўляюцца ўзнагароджаннямі за выкананне працоўных ці іншых абавязкаў і якія атрымліваюцца ад прафсаюзных арганізацый членамі гэтых прафсаюзных арганізацый, у тым ліку ў выглядзе матэрыяльнай дапамогі, падарункаў і прызоў, аплаты кошту пуцёвак, у межах 30 базавых велічынь у суме з усіх крыніц на працягу каляндарнага года;

— дабрачынная дапамога ў грашовай і натуральнай форме, якая атрымліваецца ад арганізацый і фізічных асоб інвалідамі і непаўналетнімі, якія не маюць бацькоў (бацькі ці маці), у межах да 300 базавых велічынь у суме з усіх крыніц на працягу каляндарнага года.

У выпадку, калі фізічная асоба атрымае названыя вышэй даходы звыш указаных велічынь і пры ўмове, што ў фізічнай асобы ўзнікне абавязак па падачы дэкларацыі, то яна павінна ўключыць усю суму атрыманых даходаў у сукупны гадавы даход;

4. даходы, для якіх Законам устаноўлены асобы парадак падаткаабкладання. Гэта даходы:

— у выглядзе дывідэндаў, за выключэннем выпадкаў, калі з такіх даходаў падатак не быў утрыманы крыніцай выплаты даходу;

— даходы, атрыманыя за выкананне грамадскіх абавязкаў у камісіях па падрыхтоўцы і правядзенню выбараў, рэферэндуму, па правядзенню галасавання па адкліканню дэпутата, за выключэннем выпадкаў, калі з такіх даходаў падатак не быў утрыманы крыніцай выплаты даходу;

— даходы, атрыманыя нашчадкамі (правапераемнікамі) аўтараў твораў навукі, літаратуры, мастацтва, вынаходніцтваў, карысных мадэляў, прамысловых узораў і іншых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці, у тым ліку нашчадкамі асоб, якія з'яўляюцца суб'ектамі сумежных правоў, за выключэннем выпадкаў, калі з такіх даходаў падатак не быў утрыманы крыніцай выплаты даходу;

— даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі (акрамя работнікаў, якія ажыццяўляюць абслугоўванне і ахову будынкаў, памяшканняў, зямельных участкаў) ад рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій (далей — Парк) па працоўных дагаворах, рэзідэнтамі Парка — індывідуальнымі прадпрымальнікамі; фізічнымі асобамі, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у рэалізацыі зарэгістраванага згодна з рашэннем Назіральнага савета Парка бізнэс-праекта ў сферы новых і высокіх тэхналогій, ад нерэзідэнтаў Парку па працоўных дагаворах;

— даходы ад здачы ў арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых і нежылых памяшканняў іншым фізічным асобам, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, памер якіх не перавысіў 500 базавых велічынь у 2006 годзе;

5. даходы, падаткаабкладанне якіх ажыццяўлялася ў 2006 годзе па стаўцы 20 працэнтаў не па месцы асноўнай працы (службы, вучобы).

Асаблівасцю будучага дэклараванне сукупнага гадавога даходу з'яўляецца тое, што пры падачы плацельшчыкам адпаведнай заявы не па месцы асноўнай працы (службы, вучобы) (у бухгалтэрыю) і (або) у падатковы орган, падаткаабкладанне такіх даходаў можа ажыццяўляцца па прагрэсіўнай шкале ставак падаходнага падатку з уключэннем іх у сукупны гадавы даход і прадастаўленнем дэкларацыі ў падатковы орган.

Пры гэтым, у выпадку, калі фізічная асоба на працягу года падала не па месцы асноўнай працы (службы, вучобы) заяву аб падаткаабкладанні яго даходаў па прагрэсіўнай шкале ставак падаходнага падатку, то пасля заканчэння года яна не мае права патрабаваць пераразлік падатку па стаўцы 20 працэнтаў. Калі фізічная асоба на працягу года не падавала заяву і плаціла падаходны падатак па стаўцы 20 працэнтаў, то іх можна ўключыць у дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе і падатковы орган зробіць пераразлік падаходнага падатку зыходзячы з прагрэсіўнай шкалы ставак падаходнага падатку;

6. даходы з некалькіх крыніц, але сума сукупнага гадавога даходу, які абкладаецца, не перавысіла 7 360 010 рублёў;

7. даходы, атрыманыя фізічнай асобай толькі па месцы асноўнай працы (службы, вучобы), нават калі сума сукупнага гадавога даходу, які абкладаецца, перавысіла 7 360 010 рублёў і на працягу года мянялася месца асноўнай працы (службы, вучобы), пры ўмове, што пасля звальнення па месцы асноўнай працы (службы, вучобы) фізічнай асобе не выплачваліся ніякія даходы, што абкладваюцца падаходным падаткам па прагрэсіўнай шкале ставак падаходнага падатку (па стаўках пункта 1 артыкула 18 Закона), напрыклад, прэміі, матэрыяльная дапамога.

**Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць у інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па месцы жыхарства або на сайце www.nalog.by.**

## ПАД ЗАВАЛАМІ ЗАГІНУЛІ ДВОЕ ПАДЛЕТКАЎ

**Пад заваламі будынка загінулі двое падлеткаў. Надзвычайнае здарэнне адбылося 7 студзеня ў былым ваенным гарадку вёскі Зябраўка Гомельскага раёна.**

Паводле інфармацыі прэс-службы Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, у раённы аддзел па НС паведамленне аб трагедыі паступіла ў 12.58. Як стала вядома, трое падлеткаў адправіліся на тэрыторыю вайсковай часці для разбору на цэглу аднаго з двухпавярховых будынкаў, якія пуставалі. Падчас работы абвалілася нясучая сцяна, пад якой і апынуліся двое хлопчыкаў 15 і 17 гадоў. 14-гадовы падлетак знаходзіўся па-за будынкам і таму застаўся жывы. Ён і паведаміў аб тым, што адбылося.

**Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.**

## ЗА СЛУЖБОВУЮ ХАЛАТНАСЦЬ — У КАЛОНІЮ

Некалькі месяцаў таму мы паведамлялі аб тым, што на птушкафабрыцы «Беларуснафта—Асобіна» загінула дзевяноста тысяч курэй, і прадпрыемству было нанесена звыш паўмільярда рублёў страт. З прычыны гэтага была ўзбуджана крымінальная справа, у ходзе якой устаноўлена: падзеж птушкі адбыўся з-за парушэнняў умоў утрымання і кармлення, якія з-за службовай халатнасці дапусцілі былыя заатэхнік і ветэрынарны ўрач. Днямі вынесены прыгавор: вінаватыя павінны будуць правесці год і паўтара года ў калоніі і выплаціць звыш 531 мільёна рублёў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ГКТПУП «Звезда», г. Борисов (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион по продаже следующего имущества:**

| № лота | Наименование имущества | Год выпуска | Начальная цена с НДС, бел.руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | Автомобиль легковой «ГАЗ 3110», седан. | 1998 | 3360 000 |
| 2. | Автомобиль грузовой «ИЖ 271501», фургон. | 1992 | 845 000 |
| 3. | Автомобиль грузовой «ЗИЛ 130», фургон (разукомплектован). | 1980 | 775 000 |
| 4. | Автомобиль грузовой «МАЗ 55371», фургон тентовый. | 1992 | 9640 000 |
| 5. | Автомобиль грузовой «ГАЗ 3307 ГЗСА 891», фургон. | 1992 | 2403 000 |
| 6. | Автомобиль грузовой «ГАЗ 3307», фургон. | 1993 | 2560 000 |
| 7. | Автомобиль грузовой «ЗИЛ-ММЗ-555», самосвал. | 1982 | 1526 000 |

Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с №3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата объекта производится победителем аукциона в течение 30 дней с даты подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 08.02.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 07.02.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

**Контактный телефон (8017) 224-61-34. Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

Прэм'ера

# ТРАГЕДЫЯ. БЕЗ ВАРЫЯНТАЎ

Прага ўлады зрабіла Макбета забойцам і ператварыла ў тырана. Такая думка прыйшла пасля прагляду загадкавага спектакля, які пастаўлены на сцэне тэатра імя Янкі Купалы. Але аўтар, не менш загадкавы Шэкспір, напэўна, падумаў бы пра тое, ці правільна яго зразумелі.

Што зробіш — гэта прывілея сучаснага мастацтва, калі дзеля нейкай ідэі рэжысёр можа ўзяць аўтарскі тэкст за аснову, пераасэнсаваць яго, як таго патрабуе яго задума, нават скараціць тое, што ёй не адпавядае. Постмадэрнізм у тэатры дазваляе вольнасці. Тым больш іх хочацца апраўдаць і дараваць, калі за гэты постмадэрнізм бярэцца пастановачная група з блізкай нам краіны Літвы, дзе эстэтыка сучасных накірункаў вельмі папулярная. Ці не так?

Літоўскі рэжысёр Альгірдас Латэнас зрабіў свой варыянт «Макбета», які адрозніваецца ад класічнага не толькі трактоўкай некаторых момантаў. Спектакль атрымаўся цалкам сучасным па стылістыцы ад касцюмаў мастачкі Страўкайтэ і сцэнаграфіі Макарэвічуса, якая робіць усе падзеі спектакля абстрактнымі (яны могуць адбывацца незалежна ад часу і прасторы). Спектакль атрымаўся канцэптуальным па колерах — мінімалізм у чорна-бела-шэрых танах. І вельмі цікавы ў пластычным вырашэнні. На аматара, канешне, але ёсць пэўная частка гледачоў, якія прымуць такую знешнюю форму, не разважаючы, наколькі ўсё гэта новае. Тым больш што па зместу быццам бы ўсё зразумела: муж з жонкай задумалі ўбраць канкурэнтаў і самі ж ад свайго зла пацярпелі. Канешне, не без падказак нячыстай сілы, якая закідвае свае сеткі і ловіць гатовенькіх грахаводнікаў. Гэтая лінія якраз паказана пераканаўча: галоўная вядзьмарка — тая ж лэдзі Макбет, якая носіць страшныя думкі ў сваёй галаве.

Паводле Шэкспіра, зло справакавала вялікае каханне Макбета да сваёй лэдзі. Менавіта яна падштурхоўвае яго на забойства. Зрабіўшы першы крок, ён робіць другі і ператвараецца ў закончанага тырана. У той час як Лэдзі Макбет вар'яцее ад усяго, што адбылося.

Рэжысёр Латэнас ад гэтага не адыходзіць. Толькі чамусьці ператварэння ў героях не адчуваецца. Ні ў ім — Макбет (Алег Гарбуз) у спектаклі атрымаўся такі, што нібыта адразу гатовы да зла, доўга пераконваць не трэба. Ні ў ёй — Лэдзі (Святлана Зелянкоўская), паводле Латэнаса, памірае ад таго, што забівае дзіця ў сабе. Усё холадна пралічана і прыдумана, каб звязаць пачатак з фіналам. Але чамусьці не шкада ні яго, ні яе, ні нават іх дзіця. Можа, так і было задумана? Ды і ў Шэкспіра, здаецца, усё прыходзіць да гэтага. Толькі шлях іншы. Шлях, на якім бачна, як пакутуе чалавечая душа, якая выбіраючы зло, а не дабро, сама сябе забівае. Так, можна скараціць Шэкспіра і нешта за яго дадумаць. Але калі пры гэтым губляецца частка душы (ці магчымых разважанняў пра душу) у спектаклі, ці не значыць, што яго ідэя ў нечым губляе сама сябе?..

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## СКАНВОРД

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.




## КАЛЯДНАЕ СВЯТЛО

**У Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва адкрылася святочная выстава «Каляднае святло».**

Больш за 60 аўтараў розных накірункаў у творчасці: ад рэалістаў да авангардыстаў адлюстравалі свае ўспрыманне зімы, навагодніх і калядных святаў.

Гледачам прадстаўлены скульптуры, графіка, габелены... Выстава будзе працаваць да Старога Новага Года.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (6 студзеня). Па гарызанталі:** Шампанскае. Астра. Кар. Плот. Палова. "Лад". Рэшта. Ласка. Факт. Каток. Каланада. Якар. Атара. Азу. Душ. Радыст. Апіс. Мора. Каніна. Крапіва. Ілек. Акно. Гара. Аксай. Прас. Адэпт. Донар. Кіно. Бурак. "Гамлет". **Па вертыкалі:** Лапа. Каронка. Квазар. Торт. Рудакоп. Шар. Чуб. Смага. Антракт. Пасад. Вір. Дока. Пракол. Кадр. Варэнік. Авал. Пан. Града. Лашак. Астрог. Скат. Кана. Аніс. Катар. Піла. Ода. Іней. Снягурка. Ясак. Брэст.

**Сканворд (23 снежня). Па гарызанталі:** Кінематаграфіст. Рышэльe. Акрабат. Шпак. Тын. Опера. Опій. Хлястоў. Кіт. Агра. Дранка. Гронка. Аборка. Тон. Зуб. Марэна. Штраф. Шашкі. Ліс. Нара. Ролік. Нарад. Баба. Пракат. Шарапава. **Па вертыкалі:** Сход. Работа. Пляма. Нарзан. Каток. Куфар. Опт. Марка. Араб. Кроў. Шарабан. Шар. Рак. Алея. Шабаш. Голуб. Дата. Атака. Мір. Алеуты. Арба. Нота. Гантэлі. Літр. Конік. Ананас. Атава.

## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.25 | 16.08 | 7.43 |
| Віцебск — | 8.21 | 15.51 | 7.30 |
| Магілёў — | 8.15 | 15.58 | 7.43 |
| Гомель — | 8.04 | 16.03 | 7.59 |
| Гродна — | 8.39 | 16.25 | 7.46 |
| Брэст — | 8.31 | 16.33 | 8.02 |

**Месяц**

*Апошняя квадра.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

*Пр.* Сцяпана, Фёдара.
*К.* Аліцыі, Тэрэзы, Адрыяна, Антонія, Юльяна.

## Надвор'е на заўтра




Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +11 — +13 °С | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | +7 — +9 °С | |
| КІЕЎ | +5 — +7 °С | Без ападкаў |
| МАСКВА | +3 — +5 °С | |
| РЫГА | +8 — +10 °С | |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | +6 — +8 °С | Без ападкаў |

## 9 студзеня

*Дзве даты*




**1897 год** — адбыўся першы Усерасійскі перапіс насельніцтва. Паводле атрыманых даных, у Беларусі на той момант пражывала 6 мільёнаў 899 тысяч чалавек. У тым ліку ў Мінску — 90 900, Гродне — 47 000, Гомелі — 36 800, Брэсце — 46 560, Магілёве — 43 300, Віцебску — 65 940.

**1799 год** — у Англію ўпершыню ў свеце ўведзены падаходны падатак.

*Цытата дня:*

***«Справа разумных — прадбачыць бяду, пакуль яна не прыйшла; справа смелых — спраўляцца з бядой, калі яна прыйшла».***

**У суд Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Рамазанава Тэльмана Рамазанавіча,** 1 красавіка 1968 года нараджэння, ураджэнца горада Каспійска Рэспублікі Дагестан, РФ, апошняе вядомае месца жыхарства на сакавік 2000 года — г. Жлобін, вул. Першамайская, д. 52, кв. 39. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Т.Р. Рамазанава, паведаміць іх суду Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Тарасевіча Сяргея Сцяпанавіча,** 24 чэрвеня 1970 года нараджэння, ураджэнца г. Століна Брэсцкай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Жлобін, вул. Першамайская, д. 168, кв. 66. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра С.С. Тарасевіча, паведаміць іх суду Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

## СЯМЕЙНЫ КУТОЧАК



*Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.*

Свет дзяцінства

### ДЗЕД, які заўсёды ЁСЦЬ!

Мае сыны (аднаму — восем, другому — больш... Удвая) Дзеда Мароза чакаюць. Першы, як вы разумееце, проста дазваляе сябе падманваць, другі — як бы на раздарожжы, бо і хочацца ж верыць, што дзед той чароўны ёсць, і сумненні з'яўляюцца...

Але ж на тое ў іх і мама, каб усё разумець, усё чыста ўмець, а ўжо цуды рабіць... Ды лёгка!

Увечары 31 снежня, выбраўшы зацішак паміж святочнымі прыгатаваннямі, я старанна загарнула падарункі, якія падрыхтавала для сваіх сямейнічкаў, склала іх у сапраўдны вялізны мяшок, перавязала шыкоўнай тасьмой і аднесла суседцы. Папярэдне мы з ёй дамовіліся, што праз некалькі хвілін пасля наступлення Новага года, яна паставіць мех каля нашых дзвярэй і націсне на кнопку званка.

...Апошнія гадзіны старога года, як заўсёды, цягнуліся доўга. Праўда, не для ўсіх. Малодшы наш сябрука знайшоў на ніжнім паверсе, а ўжо разам яны — нейкую забаву з перабежкамі: то ў нас абое, то паверхам ніжэй. Дзверы — толькі ляпаюць. Адпаведна — ціснецца кнопка званка, нехта ідзе адчыняць.

У чарговы раз рушыла я і... ледзь не самлела: мех на парозе! А ў любое ж імгненне могуць з'явіцца дзеці... Паспрабуй тады, дакажы, што ты тут ні пры чым.

— Я правільна ўсё зрабіла? — высунула галаву суседка. І, убачыўшы мой твар, тут жа пацягнула мех назад, прыгаворваючы, што я сама ва ўсім вінавата, не папярэдзіла ж, маўляў, пасля каторага Новага года.

Бліжэй да наступлення нашага мы, усёй сям'ёй, сядзелі за сталом, слухалі віншаванне Прэзідэнта, глядзелі на стрэлкі гадзінніка... Калі ж праз хвільку пасля 12 у дзверы да нас пазванілі, адчыняць я пайшла са сваім малодшым. Ён — шчыра скажу — ніяк не чакаў убачыць тое, што ўбачыў...

Разгубіўся, здзівіўся, запляскаў у ладкі... І, канешне ж, не заўважыў прыадчыненых дзвярэй насупраць. А вось тое што нехта, у чырвоным, мільгануў уніз па лесвіцы, згледзеў...

Зрэшты, пра гэта, стакроць паўтараючы «Ёсць Дзед Мароз! Ёсць!», ён усім расказваў потым, пасля таго, як развязалі мех і павыцягвалі з яго падарункі.

**Наталля ШВЕДАВА,**
*г. Мінск.*

Лініі жыцця

### «УСЁ МАГЛО АТРЫМАЦЦА ІНАЧАЙ»

Дзяўчом яна была нягеглай, нязграбнай, з тонкімі, як у вераб'я ножкамі, з доўгімі рукамі. Сталела потым, рвалася ўверх, а няскладнасць па-ранейшаму заставалася. Таму, калі на дыскатэцы нехта з хлопцаў кінуў: «Што гэта за аглоблі ля сценкі стаяць?», яна не здзівілася, — проста, праклінаючы усіх на свеце, пабегла дамоў. Праплакала там да самага ранку і смела, бо ведала, што ніхто не пачуе. Маці ў гэты час, як заўсёды п'яная, спала ў суседнім пакоі з чужым і гэткім жа п'яным мужыком. А бацькі ў Веркі даўно не было. Дакладней — ён быў, але жыў не з імі, недзе далёка. У Казахстане ці што?..

На дыскатэкі яна больш не пайшла. А школу скончыла цалкам прыстойна — нават паступіла адразу — у тэхнікум.

Вучоба ў ім азнаменавалася дзвюма падзеямі. Па-першае — бясслаўна, ад гарэлкі, сканала маці, па-другое, хаваць яе вызваўся Сяргей — такі ж цыбаты малады чалавек. Вера тады дрэнна ведала яго, саромелася, не хацела браць з сабою, але ён так смела прыгарнуў яе да грудзей, так пяшчотна пацалаваў, што яна заплакала: яе ні разу ў жыцці, ніхто вось так не шкадаваў.

Праз год пасля смерці маці яны пажаніліся. Вяселле справілі сціплае, бо жаніх (ён быў, так бы мовіць, фундатарам: купляў пярсцёнкі, сукенку, туфлі, заказваў столікі ў рэстаране) сказаў: «Навошта вар'яцець? Радасць — яно, брат, не ў гэтым».

Словы яго шчасцем гаючым запоўнілі Верчына сэрца: канешне ж не ў гэтым! І ён, яе абраннік, яе каханы, муж, ведае, у чым...

Была ў іх першая шлюбная ноч, быў мядовы месяц, падчас якога яна ўпершыню адчувала сябе не брыдкім качанём, а сапраўднай прыгажуняй, жанчынай. Калі ж זацяжарала і акруглілася, настолькі пахарашэла, што ўслед ёй стаў азірацца ледзьве не кожны...

Чаканне дзіцяці для Веркі было працягам той яркай, перадвясельнай, шчаслівай паласы. Але мужаву адчужанасць яна адчула. Сяргей быццам гаварыў з ёй, смяяўся, цалаваў, а ўсё, як пад прымусам — цмокне ў шчаку, пагладзіць пакаты жывот і сыдзе. «У нас хлапечнік, — скажа, калі вернецца. — Не плач, дурненькая». А дурненькая сэрцам чула, што хлусіць ён, што ніякі там не хлапечнік.

Не памылілася: па восені, калі з дзіцем, з хлопчыкам сваім, з Васільком, вярнулася з прагулкі, ён сказаў: «Я пакідаю цябе... Трэба развесціся».

Яна сцялася, моўчкі пайшла ў спальню, лягла, бо не бачыла перад сабой нічога. Свет засцілала крыўда — за свайго маленькага безабароннага і непатрэбнага (роднаму бацьку!) хлопчыка, за сябе, гаротніцу і сірату...

У якой раптам... знайшоўся бацька. Нехта, відаць, напісаў ці пазваніў яму пра Верчына замужжа, пра ўнука, пра развод і цяпер ён... ехаў.

Верка не бачыла бацьку амаль 20 гадоў. Помніла як нема крычала маці, калі ён ад'язджаў — з другой, з маладзенькай. Як потым высахла ўся і зжаўцела тварам, як не бачыла яе, як прыняла нейкага прыблуду... Першы той не вельмі піў, але біўся — без літасці. Выгнала. Знайшоўся другі — зусім іншы, ціхмяны. І піў ён гэтак жа ціха, наліваючы ёй. Казаў: «Здымі, Кацёк, камень з душы, вазьмі віна. Палягчэе».

Лягчэла, мусіць, бо маці, напіўшыся, больш не плакала, не перажывала, што яе пакінулі, была вясёлай і смелай. Нават спявала. Так, пакрыху, і захварэла — запіла...

Бацька прыехаў пад вечар. Верка адчыніла і, з палонікам у руцэ, замерла ля парога: на здымку, які абачліва паставіла на стол, быў малады, хударлявы мужчына. Гэты ж быў сіваваты, мажны, з вінавата-цёплым позіркам і пытаннем:

— Ну то прымеш, дачка?

Усю ноч яны гаварылі. Болей, канешне, бацька:

— Ты, — казаў, — даруй мне. Памыліўся я, ашукаў тваю маці.

— Выходзіць, і я — твая памылка?

— Не, ты — радасць.

— Радасць не пакідаюць, з ёю жывуць. Васілёк вось...

— Ты не павінна паўтарыць дарогі, якой прайшла твая маці. Ты не павінна прыніжацца. Гэта робіць жанчыну брыдкай і вартай адно толькі — жалю... Ты званіла яму?

— Так.

— Ты ездзіла? Прасіла вярнуцца?

— Так.

— Не трэба было... Ты кахаеш яго?

— Вельмі...

Раніцай ён паклаў на стол вялікі пачак грошай, сказаў строга, не дапускаючы адмовы:

— Яны твае. Сёння ж схадзі ў салон — пастрыжыся, зрабі хімію, манікюр... Ці што там яшчэ?.. Я ў гэтым не вельмі разбіраюся. Махні на рынак. Грошай — не шкадуй: купі ўсё, што спадабаецца. Вечарам сустрэнемся.

І выйшаў за парог. Куды пайшоў, спытаць не паспела. Пачак грошай на стале перахапіў дыханне, адняў усе чыста словы. Яна ніколі не трымала ў руках такога багацця, а тое, якое мела, не магла патраціць на сябе. Лічыла, што муж павінен кахаць і такую.

Верка не ведала, што бацька забраў з садка малога, што разам яны з'ездзілі на вясковыя могілкі, дзе была пахавана маці.

— Ты — Брыджыт Бардо... У маладосці! Сапраўдная каралева! — вечарам хвалілі яе ж мужчыны. — Глядзі ж, каб так выглядала заўсёды. Сачы за сабой, будзь дужай, глядзі Васілька і часцей усміхайся, — павучаў старэйшы.

Верка слухала яго, глядзела ў люстэрка і бачыла там... другую жанчыну — разумную, задаволеную сваім жыццём, цікавую.

— Малайчына! — падміргваў з-за спіны бацька. — Няхай ён па табе зараз сохне, а не ты...

— Мы з ім часта бачымся.

— Вось і добра. Віснуць толькі не трэба. Мужчыны гэтага не любяць, ногі аб такіх выціраюць.

...Праз тыдзень бацька паехаў. Абяцаў прыязджаць, абяцаў пісаць, а то і наогул вярнуцца дамоў, на радзіму, бо там, на чужыне яго, як быццам, нішто не трымала — другая жонка рана памерла, дзеці выраслі...

Сяргея ж з таго ад'езду Вера, быццам, не бачыла — горда ўсміхалася, праходзіла міма.

Ён сам не ўстрымаўся падышоў аднойчы да століка, за якім яна абедала, спытаў:

— Адкуль у нашай сталоўцы такая мадонна?

Апусціла відэлец, падняла позірк. Перад ёй, схіліўшы галаву, стаяў мужчына ў зацёртых джынсах і нясвежай сарочцы. «Ага, не салодка табе, — заўважыла Вера. — Зблажэў, асунуўся».

Пасля гэтага ён часцяком стаў названьваць да іх па тэлефону, прыходзіць у садок па малога, не раз узнімаўся на былы свой паверх. І аднойчы яна змаглася — адчыніла яму, упусціла ў пярэдні пакой.

— Даруй, — сказаў ён, — і... бухнуў перад ёй на калені.

— Ты што звар'яцеў? — пачырванела Вера. — Зараз жа ўстань.

— Не. Пакуль не прабачыш, не прымеш назад...

— Ды брыдка ж глядзець. Уставай, ну, хуценька! І... распраніся... Я мыць якраз збіраюся.

...Бацька да Веры больш не прыехаў. Ні праз год, ні праз два. Дачка не крыўдавала, ведала: ён прыляціць, калі зноў, не дай Бог, выпадзе гнятлівая часіна, ён падкажа ёй, дапаможа.

Яна была ўдзячна яму. І вельмі шкадавала, што некалі вось такога разумнага, спагадлівага настаўніка не знайшлося ў яе матулі. Яно ж і ў яе ўсё магло атрымацца іначай.

**Мікалай МАРОЗ,**
*г.п. Шуміліна.*


## КІРМАШ

штотыднёвы рэкламны выпуск № 1 (534)

аддзел рэкламы ☎ 287-17-79

Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### Прадаецца

■ Дом 12х5, г/п, лазня, склеп, сад у в. Дуброўка Бярэзінскага раёна.
Тэл. (8-02137) 2-91-49.

■ Дом драўляны ў в. Порплішча Докшыцкага раёна. Тэл. 8-029-555-35-07.

■ Кватэра ў будуемым 2-кватэрным доме з майстэрняй, пастаянная справа сямейнаму з в/а чалавеку (11 км ад Брэста).
Тэл. 8-025-901-69-81.

■ Прадам ці абмяняю 3-пакаёвую кватэру з кабельным TV (г. Беразіно). Разгледжу любыя варыянты.
Тэл. (8-01715) 56-360.

■ Гараж 3х6 м, маецца яма, склеп, ахова ў г. Мінску па вул. Трасцянецкай.
Тэл. 8-029-654-11-62.

■ «Опель кадэт» 1979 г.в.,1,3б, зялёны хэтчбэк, на хаду ці на з/ч, цана па дамоўленасці.
Тэл. 8-029-563-99-61.

■ «Форд-скорпіо» 1992 г.в., 2,5 ТД, 2500 у.а., у Навагрудку.
Тэл. 8-029-349-32-21.

■ Тэлевізар каляровы «Гарызонт», тачка будаўнічая металічная да 70 кг, прынтар каляровы.
Тэл. (8-01593) 4-03-93.

■ Мёд, оптам 40 л па 10 тыс. за 1 л.
Тэл. (8-02152) 3-46-48.

■ Самаробны трактар з прычэпам на бензіне 20 к.с., 1300 у.а., бароны трактарныя 2 шт., цыркулярка — 90 у.а., сячкарня — 80 у.а., рухавік 3 кВт., варштат.
Тэл. (8-01770) 35-363, пасля 15.00.

■ Свіння.
Тэл.: (8-01774) 7-47-44, 8-029-277-08-69.

■ Кухонная электрычная печка (варыць, смажыць, пячэ), б/к, выдатны стан.
Тэл. у Мінску 233-33-40.

■ Дзве казы дойныя, ядуць усё, што дасі.
Тэл. (8-01797) 4-67-38.

■ Газавая пліта «Гефест» Брэст, новая ва ўпакоўцы.
Тэл.: (8-017) 295-96-84, 8-029-654-11-62.

■ Эл. тэльфер грузападымальнасцю 500 кг, вышыня пад'ёму 6 м.
Тэл. 8-029-871-93-59.

■ Бульбакапалка конная.
Тэл. (8-01514) 3-38-12.

■ Плуг конны, млын, камплект газазваршчыка, вал фуговачны.
Тэл. (8-02351) 2-63-68.

■ Кузаў ВАЗ 21013, дах, багажнік, КПП, стартэр, масты ў зборы.
Тэл. у Мінску 271-22-25.

### Куплю

■ Мотаблок у любым стане.
Тэл. 8-029-183-44-70.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, прылады і з/ч да іх.
Тэл. у Мінску: 253-24-41, 8-029-850-17-29.

■ Мотаблок МТЗ.
Тэл. 8-029-400-08-52.

### Рознае

■ Здыму дом з гаспадарчымі пабудовамі ў арэнду на год, да 60 км ад Мінска.
Тэл. 8-029-357-64-51.

■ Абіўка мяккай мэблі, выбар тканіны, выезд на вобласць.
Тэл. (8-017) 256-26-47.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**
**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.**

**Тэлефон для даведак 287-17-79.**

Пашпарт серыя__________ № __________ Выданы__________

Подпіс__________ Дата__________

Правление СВК «Деревное» Столбцовского района Минской области
**ПРИГЛАШАЕТ НА РАБОТУ**
**агронома-химика, электромонтеров, начальника участка.**
*Жилье предоставляется.*
**Конт. телефоны: 8-01717-50001, 58-298, 58-294.**


## Віншаванні

*Віншуем з днём нараджэння **Сяргея Мікалаевіча ГАМЗУ** з в. Жукаў-Барок. Жадаем моцнага здароўя, поспехаў у справах, дабрабыту.*

**Сям'я Казлоўскіх.**

*Мілую, пяшчотную, слаўную ўнучачку **Алесю АСМЫКОВІЧ** віншуем з 18-годдзем. Жадаем моцнага здароўя, поспехаў, удачы, адзінага моцнага кахання.*

**Бабуля Феня, дзед Коля,** *г. Жлобін.*

*Віншуем з днём нараджэння дарагую **Надзею Нічыпараўну ТОНКАВІЧ.** Жадаем моцнага здароўя, шчасця і радасці ў жыцці.*

**Муж, дзеці, унукі,** *в. Дварэц.*

*Віншую з 83-годдзем **Рыгора Андрэевіча КУЛАЖАНКУ** з Дзяржынскага раёна. Жадаю шчасця, бадзёрага настрою, радасці ў хаце.*

**Сястра Ніна.**

*Віншуем з днём нараджэння **Дзмітрыя ШЫРВЯЛЯ.** Жадаем моцнага здароўя. Заставайся такім жа прыгожым, вясёлым і клапатлівым бацькам і мужам.*

**Жонка, дзеці,** *г. Івянец.*

*Віншую з днём нараджэння Святлану **Пятроўну СУХАНСКУЮ** з Мядзеля. Жадаю шчасця і здароўя, хачу, каб Бог ваш дом бярог і не было ў ім няшчасця.*

**Сястра з Гродна.**

*Сардэчна віншуем з днём нараджэння **Любоў Трафімаўну ГУНІЧ** з Калодзішчаў. Жадаем шчасця, здароўя без лекаў, дабра і спакою і доўгага веку.*

**Вера, Лена,**
*в. Галынь.*



*Віншуем дарагую **Ларысу Міхайлаўну ХВАЛЬ** з в. Цырын з юбілеем. Жадаем моцнага здароўя, поспехаў у працы, дабрабыту.*

**Сястра, пляменнікі,** *в. Ярэмічы.*

*Віншуем любага і дарагога мужа і татачку **Леаніда Іванавіча АПАНОВІЧА** з 50-годдзем. Жадаем шчасця і здароўя і каб на ўсё хапала сіл, і кожны дзень, табой пражыты, каб толькі радасць прыносіў.*

**Жонка, сын Віталь, дочкі Алена і Надзея,**
*в. Дрэбск.*

*Дарагога і паважанага **Сяргея Лявонцьевіча КАЗЛОЎСКАГА** з г. Мінска шчыра віншуем з днём нараджэння.*
*Моцнага табе здароўя, сямейнага дабрабыту, павагі, дабра і цяпла.*

**Родныя.**


ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.093. Індэкс 63850. Зак. № 128. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12